## Аглядная экскурсія па школьным краязнаўчым пакоі

## I. Гістарычнае мінулае нашага краю

Аршаншчына! Цудоўны і чароўны край! Тут над кожным камнем, на дне кожнага возера схавана легенда або быліна – жамчужына народнай мудрасці. Чым лепш пазнаеш свой край, тым больш уражвае ён сваімі цудоўнымі справамі і здзяйсненнямі, тым мацней любіш яго, тым больш хочацца зрабіць для яго росквіту.

Сёння ў нашым школьным краязнаўчым музеі пройдзе аглядавая экскурсія.

Мы пазнаёмімся з развіццём роднага краю ад далёкай даўніны і да нашых дзён. І пачнём нашу экскурсію з гістарычнай даведкі.

Аршанскі раён знаходзіцца на паўднёвым усходзе Віцебскай вобласці. Узнік ён 17 ліпеня 1924 года. Плошча раёна 1,7 тыс. кв.км. на тэрыторыі раёна 293 населеныя пункты. Вёска Крапіўна знаходзіцца на рацэ Крапівенка, левым прытоку Дняпра. Сваю назву вёска і рэчка атрымалі ад назвы расліны крапіва, якой, мабыць, было вельмі многа па берагах рэчкі.

Жывуць на Аршаншчыне патомкі старажытных славянскіх плямён - дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў – беларусы. Яны складаюць 85 % насельніцтва. Жывуць тут рускія, палякі, украінцы і іншыя народы.

Прырода шчодра адаравала Аршаншчыну лясамі, лугамі, азёрамі, паўнаводнымі рэкамі і багаццем будаўнічых матэрыялаў: даламіту, пясчана-гравійнага матэрыялу, будаўнічых пяскоў, цэглы.

Надзвычай цудоўныя шматлікія рэкі нашага краю… Задуменна нясуць свае воды ўздоўж паросшых лясамі і хмызнякамі берагоў Днепр, Адроўка, Крапівенка.

А што было на гэтых месцах раней? Давайце завочна перанясёмся ў старажытныя часы. На тэрыторыі Беларусі чалавек паявіўся паміж заканчэннем Дняпроўскага абледзянення і Нававалдайскай стадыяй апошняга ледавіка (10-40 тыс. гадоў назад), у сярэднім палеаліце. Найбольш старажытныя прылады працы – вастраканечнікі, скрэблы, адшчэпы. Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі – неандэртальцы – папярэднікі сучаснага чалавека. Яны палявалі на буйных жывёл (маманта, шарсцістага насарога), займаліся збіральніцтвам, навучыліся здабываць агонь, будаваць жыллё. На стэндзе мы бачым бюст неандэртальца, а побач зуб маманта, які знойдзены на тэрыторыі сельскага савета.



У 6-7 ст.ст. да нашай эры плямёны, што жылі на тэрыторыі Беларусі, як і іншыя плямёны Усходняй Еўропы, навучыліся здабываць жалеза, вырабляць з яго прылады працы, зброю, упрыгожванні. Адкрыццё жалеза азначала пачатак вялікага тэхнічнага перавароту. У экспазіцыі захоўваецца грыўня – вагавая, лічбавая і грашовая адзінкак Старажытнай Русі. Яна бытавала на тэрыторыі Беларусі да 13 стагоддзя.

## II. Прырода роднага краю

Наступны раздзел музея – прырода роднага краю. Багаты і разнастайны раслінны і жывёльны свет Аршаншчыны. Трэцяя частка ўсёй тэрыторыі раёна пакрыта лясамі. Яны прыдаюць асаблівую прыгажосць мясцоваму пейзажу. Гэта па-сапраўднаму паэтычны край, які не ўступае сваёй прыгажосці самым экзатычным месцам зямлі. Аб тым, якія расліны і жывёлы жылі раней на тэрыторыі, сведчаць археалагічныя знаходкі.

Аб прыродзе роднага краю можна сказаць словамі нашага земляка Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча:

*А вакол травіцы роснай рай*
*І бярозак белая сям'я.*
*Мой чароўны беларускі край,*
*Бацькаўшчына мілая мая.*





## III. Этнаграфічны куток

Вялікую цікавасць выклікае этнаграфічны куток, у якім адлюстраваны фрагмент сялянскай хаты.

*Тут побыт п*
*рашчураў сабраны:*
*Вяселлі, святы, будняў дні.*
*У хаце, хоць і беднай часам,*
*Заўсёды лад і дабрабыт былі.*

У экспазіцыі сялянскай хаты сабраны найыянальнае адзенне беларускай сялянкі, ручнікі, сурвэткі, карункі, прылады працы: прасніца, кросны, лапата для выпечкі хлеба і іншыя прылады працы і быту сялян.



Першае ўпамінанне аб вёсцы Крапіўна можна аднесці да 1629 года. Як сведчыць архіўная спраўка "…сяляне жылі на хутарах у падслепаватых хатах, пакрытых саломай. З раніцы да вечара яны гарбелі на сваіх невялічкіх лапіках зямлі. Жылі ўпрогаладзь…".

*За прасніцай гарбатаю*
*Матуля ледзь не плакала:*
*"Жыццё маё праклятае…*
*Праду не кужаль – пакулле"…*
*Сляза цішком свяцілася*
*/Было гэта даўно/*
*Зрывалася, кацілася*
*У кут верацяно.*
*Настольнік трэба выткаць,*
*Ручнік і паясок.*
*Прыгодна толькі нітка*
*Танчэй за валасок.*

## IV. Вёска Крапіўна ў перыяд 1917-1941 гг.

Наступны раздзел музея паведаміць нам пра складаны перыяд жыцця нашых землякоў у перыяд ад Вялікага Кастрычніка і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікі Кастрычнік прыйшоў у Крапіўна з новымі павевамі. Людзі адчувалі подых новага жыцця. У адрозненні ад іншых ім не давялося дзяліць зямлю памешчыка. Уладальнік маёнтка ў Крапіўне, прадчуваючы набліжэнне рэвалюцыйнага выбуху, прадаў сялянам па даволі нізкай цане зямлю, а сам збег.

У экспазіцыі прадстаўлена газета "Бядняк". Гэта штодзённая сялянская газета. Яна шырока асвятляла жыццё краіны, друкавала пісьмы сялян, матэрыялы пра дзейнасць калектыву беднаты. Савецкая ўлада на тэрыторыі Горацкага ўезда Магілёўскай губерні, у склад якіх уваходзіла вёска Крапіўна, была ўстаноўлена 28 кастрычніка 1917 года.


Ежедневная газета
Беднота
Одно из двух.
Вести с фронтов.

У 1929 годзе ў вёсцы Крапіўна быў арганізаваны калгас, які вырашылі назваць "Прамень сацыялізма". Першым старшынёй калгаса быў Чарняўскі Ахрэм Ціханавіч (нарадзіўся ў вёсцы Заложжа ў 1890 годзе).

У гэты ж час ствараюцца калгасы і ў іншых вёсках Крапівенскага сельскага савета. У 1931 годзе быў арганізаваны калгас "Барацьбіт", у склад якога ўваходзілі вёскі Савішчана, Барадуліна, Руклiншчына. Старшынёй калгаса быў Гайдукоў Кандрат Аляксеевіч (у 1959 г. калгас быў параіменаваны ў калгас "Імя Энгельса").

У 1932 годзе дробныя калгасы былі далучаны да калгаса "Прамень сацыялізма", у ім было 4 брыгады. У гэтым жа годзе калгас атрымаў першы трактар "Фарзон", на ім працавалі Шалуха Арцём Фёдаравіч і Каткоўскі Дзяніс Ананьевіч. У 1936 годзе калгас атрымаў першую машыну "Газ-51-АА".

На працадзень калгаснікі атрымлівалі зерне ад 0,5 да 1,5 кг., бульбы да 9 кг., гародніны да 2 кг.

З кожным годам паляпшаўся дабрабыт калгаснікаў. У 1934 годзе калгас быў поўнасцю радыёфіцыраваны. У вёсцы Крапіўна пачаў працаваць першы магазін, была створана пачатковая школа, затым сямігодка, а ў 1941 годзе Крапівенская школа зрабіла першы выпуск 10 класа.

У 1939-1940 гг. з хутароў сяляне перасяліліся ў вёску Крапіўна.




## V. Ваенныя гады

Самымі складанымі і выпрабавальнымі для нашага народа былі ваенныя гады. Аб гэтым і пойдзе наша далейшая размова.

*І аб вайне не трэба забываць,*
*Каб памылак больш не паўтараць.*

22 чэрвеня 1941 года вёску маланкай абляцела страшэнная вестка – вайна! Нашы землякі разам з усімі пайшлі абараняць Радзіму. Сярод іх былі настаўнікі нашай школы.




13 ліпеня 1941 года Орша была захоплена акупантамі.

14 ліпеня фашысты ўварваліся ў вёску Крапіўна. Гітлераўцы ўстанавілі жорсткі рэжым. На сценах і шчытах з’явіліся фашысцкія загады, якія заканчваліся адным і тым жа словам – расстрэл. З першых жа дзён Орша пакрылася сеткай канцэнтрацыйных лагераў, куды заганялі ваеннапалонных і насельніцтва. Адных адпраўлялі на розныя работы ў горад, другіх гналі ў Германію на катаргу. З вёскі Крапіўна гітлераўцы адправілі ў канцлагер Оршы сям’ю Халалея Антона, Жукавай Марыі, Казімірскага Сельвестра і іншых.

По заключэнню Аршанскай гарадской надзвычайнай камісіі па даследванню зверстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у горадзе ўстаноўлена, што за час акупацыі знішчана звыш 37 тыс. савецкіх грамадзян, зморана голадам каля 40 тыс. ваеннапалонных, за сувязь з партызанамі растраляна 2840 чалавек.

Савецкія людзі з кожным днём усё больш і больш падымаліся на барацьбу з ворагам. У Оршы дзейнічаў падпольны райком партыі.

У час акупацыі засылаліся ў тыл ворага для насельніцтва і партызан Беларусі сатырычныя выданні “Раздавім фашысцкую гадзіну”, “Партызанская дубінка” (прадстаўлены ў экспазіцыі). Яны змяшчалі фельетоны, сатырычныя вершы байкі, карыкатуры. Сродкамі сатыры выкрываліся звярыная сутнасць гітлераўскага рэжыму. Газеты заклікалі людзей актыўна змагацца з ворагам. У выданні супрацоўнічалі Я.Купала, К.Крапіва, К.Чорны, П.Броўка, М.Танк і іншыя.

На тэрыторыі Віцебскай вобласці дзейнічаў партызанскі атрад імя Канстанціна Заслонава, у якім змагаліся супраць ворагаў нашы землякі.

Восенню 1943 года пачалося вызваленне войскамі Савецкай Арміі беларускай зямлі. Горад Оршу і Віцебск фашысты лічылі ключамі ад варот на захад. 30 мая 1944 года Стаўка зацвердзіла план Беларускай наступаючай аперацыі пад назвай “Багратыён”. Важнейшая роля ў аперацыі адводзілася 3-му Беларускаму фронту, якому неабходна было разграміць ворага на Віцебскім і Аршанскім напрамку, потым наступаць на Барысаў, Мінск, Вільню, Гродна і выйсці на граніцу. Фронту дапамагалі партызаны. Ноччу на 20 чэрвеня 1944 года партызаны Беларусі нанеслі знамяніты “рэйкавы ўдар” па асноўных чыгунках у тыле ворага.

26 чэрвеня войскі 31-й Арміі занялі 85 населеных пунктаў і сярод іх горад Дуброўна. Адразу пасля вызвалення Дуброўна 331-й дывізіі была пастаўлена задача фарсіраваць Днепр і ўдарам у паўднёвым напрамку сарваць адыход 260-й дывізіі ворага на абараняльны рубеж па заходняму берагу ракі Крапівенка. Варожыя дывізіі пачалі адступленне ў напрамку на Копысь. Непрыступная абарона ворага рушылася.

27 чэрвеня была вызвалена Орша.

У 31-й Арміі ваявалі нашы землякі і сярод іх М.Ц.Засцескі. Ён прымаў удзел у вызваленні Аршаншчыны.

На адной з музейных вітрын захоўваюцца пісьмы з фронту, пахаронкі, якія прыходзілі пасля вызвалення.

Вялікія страты нанесла фашысцкая акупацыя Беларусі. Пасля вызвалення нельга было без болю ў сэрцы глядзець на разваліны і папялішчы вёскі Крапіўна. У вёсцы ўцалелі селькі савет, амбулаторыя, царква, магазін. Але ні з чым нельга параўнаць страты людзей (у экспазіцыі змешчаны спіс загінуўшых аднавяскоўцаў). Не кожны з загінуўшых абессмяроціў сябе подзвігам, але кожны з іх загінуў, абараняючы Радзіму. І ўжо адно гэта дае права на вечную памяць у сэрцах жывых.



2 чэрвеня 2014 года ў а.г. Крапіўна адбылося перазахаванне салдата, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны Бобрыка Герасіма Нікіфаравіча.

У дзяцінстве Герасіма Нікіфарафічы хрысцілі ў Аляксандра-Неўскім храме, там жа праходзіў і абрад адпявання (аг. Крапіўна). У роднай вёсцы воін-герой быў і перазахаваны.

Байцамі атрада "Прарыў" у дар школьнаму музею, як знак удзячнасці за дапамогу ў пошуках родных і арганізацыі перазахавання астанкаў, былі перададзены асабістыя рэчы Г.Н.Бобрыка, якія знойдзены на месцы, дзе загінуў салдат.

На сённяшні дзень у школьным краязнаўчым музеі створана асобная экспазіцыя, прысвечаная воіну Вялікай Айчыннай вайны Бобрыку Герасіму Нікіфаравічу.

## VI. Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны

У фондзе нашага музейнага пакою захоўваюцца рэчавыя доказы генацыда беларускага народу ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Стэндавая інформацыя прадстаўлена матэрыяламі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь аб расследваніі крымінальнай спарвы па факту генацыда насельніцтва Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У музейным пакоі размешчаны спісы ўдзельнікаў карацельных аперацый і іншых злачынстваў у адносінах да мірнага насельніцтва і ваеннапалонных на тэрыторыі БССР, карта спаленых вёсак, аб асаблівасцях устройства канцэнтрацыйных лагераў у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Оршы, актуальныя звесткі аб расследваніі крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа. Акрамя матэрыялаў у кспазіцыі размешчаны рэчы савецкіх салдат: каскі, фляги, палявая сумка, прадметы посуду, а таксама даследчая праца вучняў школы "Дзеці вайны".



## VII. Выпускнікі школы – абаронцы Радзімы

Наступны раздзел нашага музея вельмі значны і ганаровы. У ім вы даведаецеся пра вядомых выпускнікоў нашай школы, якія загінулі ў час ВАв і вайны ў Афганістане.




Працягвалі справу бацькоў, справу абароны Радзімы –выпускнікі нашай школы – афіцэры Савецкай Арміі. Чарняўскі Мікалай закончыў школу ў 1961 годзе, потым навучаўся ў Ачынскім ваенным авіяцыйным вучылішчы (у экспазіцыі размешчана пісьмо ў адрас адміністрацыі школы з падзякай за добрае выхаванне вучня).Пасля заканчэння вучылішча яго рыхтавалі ў атрад касманаўтаў. Але жыццё афіцэра закончылася трагічна: ён аблучыўся і памёр у 1969 годзе.




*Прайшоў скрозь нас і Афган:*
*Сэрцы і зараз баляць ад ран.*

Выпускнікамі школы, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане: Махначоў М., Сказецкі А., Даміканаў У.

Уладзімір Даміканаў закончыў у нашай школе 8 класаў. Быў прызваны ў армію ў 1983 годзе, служыў у разведроце. За сумленную службу быў узнагароджаны медалём Рэспублікі Афганістан. У адной з баявых аперацый, калі воіны трапілі ў засаду душманаў, Уладзімір застаўся прыкрываць адыход сяброў, але сам загінуў. За подзіг ён пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У экспазіцыі прысутнічаюць асабістыя рэчы Уладзіміра: ордэн Чырвонай Зоркі, кніга “Жил-был мальчишка” (гэта яго любімая кніга), ліскі з запісной кніжкі, на якіх зроблены запісы слоў песен аб службе ў Афганістане, уліковая картка члена УЛКСМ, гільза з зямлёй Афганістана, абараняючы якую, ён загтнуў. Памяць аб Уладзіміры Даміканаве, аб яго подзігу, аб усіх воінах-інтэрнацыяналістах назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

## VII. Гісторыя саўгаса “Днепр”

Дадзены раздзел музея раскажа нам пра ўтварэнне і развіццё саўгаса “Днепр”.

У цяжкіх умовах пачалося пасляваеннае жыццё сялян вёскі Крапіўна. Асноўны цяжар пасляваенных адраджэнняў лёг на плечы старых, жанчын,

падлеткаў. Пасля вайны ў Крапівенскім сельскім савеце на рахунку знаходзілася 12 калгасаў. У кожнай вёсцы свой калгас. У 1950 годзе да калгаса “Прамень сацыялізма” далучылі “Вясёлы бераг” (в. Сяглава), “Зарэчча” (в. Гацькаўшчына).

У 1966 годзе калгас “Прамень сацыялізма” перайшоў на грашовую аплату працы. Сярэдні заробак калгаснікаў склаў 36 рублёў у месяц.

У 1970 годзе калгас імя Энгельса быў рэарганізаваны ў саўгас “Днепр”. 31 студзеня 1977 года да яго далучаны калгас “Прамень сацыялізма”. У свой час саўгас “Днепр” спецыялізаваўся па вытворчасці малака.

Ішоў час… Мяняўся знешні выгляд вёскі, узрасла вытворчасць асноўных відаў прадукцыі: земляробства і жывёлагадоўлі. У 1973 годзе ў вёсцы Крапіўна быў пабудаваны комплекс-рэпрадуктар, а ў вёсцы Загарадная – комплекс па адкорму свіней. За атрыманне высокіх ураджаяў збожжавых, бульбы, высокіх паказчыкаў вытворчасці мяса і малака працаўнікі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі. У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі працаўнікоў-перадавікоў за добрую працу.